

*Нясвіжскі замак з боку ўязной брамы. Фота В. Дняпроўскага*

# «Вяртанне» Нясвіжскага і Мірскага замкаў

***Адзін з першых даследчыкаў абарончай архітэктуры на беларускіх землях Міхась Ткачоў называў Беларусь краінай замкаў і меў рацыю. Сапраўды ў XIV – XVIII стагоддзях на нашых землях стаяла каля 100 замкаў. Але большасць з іх былі драўлянымі і канчаткова зніклі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай. Мураваныя замкі моцна пацярпелі пад час шматлікіх войнаў і ў XIX стагоддзі ў асноўным не мелі ўладальнікаў, бо раней былі дзяржаўнай уласнасцю, альбо страцілі сваіх былых гаспадароў. Іх маляўнічыя руіны ўпрыгожвалі навакольле гарадоў і мястэчак і нагадвалі пра іх слаўную гісторыю. Некаторыя ў апошнія дзесяцігоддзі былі адрэстаўраваныя і пачалі новае жыццё.***

З усіх беларускіх замкаў найбольш, відаць, пашанцавала нясвіжскаму, збудаванаму Мікалаем Крыштафам Радзівілам Сіроткам у канцы XVI стагоддзя. Спачатку ён быў чатырохвугольны ў плане (170х120 м), абведзены высокім земляным валам з бастыёнамі па кутах. Добра ўмацаваны замак у 1660 годзе пасьпяхова вытрымаў аблогу варожага войска пад час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654 –1667 гадоў. Аднак у 1706 годзе, пад час так званай Паўночнай вайны, шведскія войскі захапілі замак і ўзарвалі яго бастыёны. У 1710 – 1720-я гады замак быў адноўлены. На працягу XVIII стагоддзя Радзівілы стварылі цудоўны палацава-замкавы комплекс, дзе захоўваліся іх шматлікія багацці. У 1812 годзе чарговы ўладальнік замка Дамінік Радзівіл перайшоў на бок Напалеона і браў удзел у вайне 1812 года на баку Францыі. Пасля вайны расійскія ўлады канфіскавалі замак і вывезлі яго багацці ў розных кірунках. На доўгі час ён быў закінуты і занядбаны.

Жыццё ў Нясвіжскі замак вярнулася ў другой палове 1860-х гадоў, калі сюды прыехалі з Германіі Радзівілы ўжо іншай лініі роду. Пасля 1875 года Антоній Вільгельм Радзівіл і яго жонка Марыя Дарота дэ Кастэлян адрамантавалі палац і зноў заснавалі парк у паўночна-ўсходняй частцы горада плошчаю 11 гектараў, які атрымаў назву «Парк Антонія». Побач захаваўся «Стары» парк (16 гектараў) з рамантычнымі павільёнамі. У 1896 годзе тут паставілі помнік вернаму сабаку князя (а ў 1990-я гады была створана алея скульптурных партрэтаў слынных дзеячаў гісторыі і культуры Нясвіжа). У 1911 – 1914 гадах англійскія садоўнікі пасадзілі Японскі сад, а насупраць Старога парку ўзнік «Новы», альбо «Марысін» парк (22 гектары). Каля Новага парку, на левым беразе Замкавай сажалкі, зрабілі іпадром, альбо Англійскі парк (10 гектараў). Замак перажыў Першую сусветную вайну, рэвалюцыі 1917 года, савецка-польскую вайну. Пасля Рыжскай дамовы 1921 года Нясвіж апынуўся ў складзе Польшчы, і ў замку зноў да верасня 1939 года жылі Радзівілы. Перажыў замак і Другую сусветную вайну.

Пасля вайны тут размясціўся санаторый, і таму палац быў дагледжаны. У 1997 годзе санаторый закрылі, і ў замку пачалася рэстаўрацыя. У 2001 годзе замкавы комплекс перадалі Нацыянальнаму гісторыка-культурнаму запаведніку «Нясвіж». Пад час рэстаўрацыі 24 снежня 2000 года ў палацы адбыўся пажар, у выніку якога згарэлі паддашак галоўнага корпуса, фрагменты даху, былі пашкоджаны фрэскі і іншыя элементы дэкору. Пасля пажару драўляныя дэталі апрацавалі спецыяльным растворам, драўляныя перакрыцці і кроквы замянілі на жалезабетонныя, памянялі дах – накрылі яго дахоўкай, зрабілі круглыя вокны з вітражамі. Была зроблена гідралізацыя сцен і падмуркаў палаца.

**(Заканчэнне на стар. 3)**

# «Вяртанне» Нясвіжскага і Мірскага замкаў

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на стар. 1)*

У 2004 годзе галоўную вежу замка аднавілі паводле гравюры Томаша Макоўскага ў стылі рэнесансу. Аднак навукоўцы выступілі супраць гэтага і патрабавалі зрабіць вежу ў стылі барока, як гэта было ў XVIII стагоддзі, у часы Міхала Казіміра Радзівіла Рыбанькі. Навукова-метадычная рада па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Беларусі прыняла нарэшце рашэнне змяніць выгляд замкавай вежы па стане на XVIII стагоддзе. Навуковым кіраўніком рэстаўрацыі замка стаў вядомы беларускі архітэктар Сяргей Друшчыц. Рэстаўрацыя палацава-паркавага ансамбля вялася з 1997-га па 2012-ы год. Комплекс Нясвіжскага замка ў 2005 годзе быў уключаны ў Спіс аб'ектаў Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Цяпер тут знаходзіцца музей, які штогод наведваюць сотні тысяч турыстаў.



*Уязная брама Нясвіжскага замка. Фота Яна Булгака. 1938 г.*

Мірскі замак пачаў будаваць прадстаўнік вядомага беларускага шляхецкага роду, надворны маршалак Вялікага Княства Літоўскага Юрый Ільініч у першай чвэрці XVI стагоддзя ў стылі готыкі каля паселішча Мір. Аднак яго будаўніцтва не было скончана і працягнулася ўжо ў другой палове XVI стагоддзя, калі ён перайшоў да магнацкага роду Радзівілаў. Адбылося гэта ў 1569 годзе, пасля смерці Юрыя Шчаснавіча Ільініча, апошняга са свайго роду. Яго спадкаемцам стаў стрыечны брат па маці Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка. Новы ўладальнік значна перабудоўвае замак у стылі рэнесансу і барока. Вакол насыпаюць валы з бастыёнамі, якія акаляюць равы з вадою. Унутры замка каля паўночнай і ўсходняй сцен узвялі трохпавярховы палац з глыбокімі сутарэннямі, а звонку – уздоўж паўднёвай і заходняй – будуюць аднапавярховыя службовыя прыбудовы. Галоўная ўваходная вежа атрымала дадатковае ўмацаванне паўкруглай формы – перадбрам'е. Каменнай разьбой аздабляюць балясы, парэнчы, прыступкі на лесвіцах, ганках, агароджы масткоў і балконаў. Інтэр'еры палаца аздабляюць шыкоўныя кафляныя печы, аблямаваныя зялёнапаліванай і паліхромнай кафляй.

Першы раз замак моцна пацярпеў ад ваенных дзеянняў у сярэдзіне XVII стагоддзя, пра што сведчыць інвентар 1660 года. Каля 30-і гадоў палац быў занядбаны. Аднаўляць замак пачалі ў 1681 годзе. Асноўныя работы ішлі з 1686-га па 1689-ы год. Аднак неўзабаве пад час Паўночнай вайны ў 1706 годзе ў Мір уварваліся войскі шведскага караля Карла XII. Замак быў спалены і разбураны. Аднаўленчыя работы тут ішлі некалькі дзесяцігоддзяў і былі скончаны ў 1738 годзе. Аднавілі палац, дзе з'явіліся партрэтная зала і зала для танцаў. У палацы мелася 16 камінаў і 17 кафляных печаў. Аднак паступова замак стаў прыходзіць у заняпад, пра што сведчыць яго апісанні, зробленыя ў 1778-м і 1794-м гадах. У пачатку XIX стагоддзя замак крыху аднавілі, калі ім валодаў Дамінік Радзівіл.

У 1812 годзе пад сценамі Мірскага замка адбываліся ваенныя дзеянні. У 1827 годзе пра замак пісалі, што ён цалкам разбураны і пакінуты. Паступова на яго пачалі звяртаць увагу навукоўцы і мастакі. Сітуацыя змянілася да лепшага, калі замак набыў у 1891 годзе князь Мікалай Святаполк-Мірскі. Каля замка выкапалі глыбокі стаў, пабудавалі на падмурках былога будынка канца XVI – пачатку XVII стагоддзя сядзібны дом і сямейную капліцу-пахавальню. Пасля смерці Мікалая Святаполк-Мірскага гаспадаром замка стаў яго сын Міхаіл. У 1921 годзе ён вярнуўся ў Мір і вырашыў пакрысе аднаўляць замак. У 1924 годзе праект адбудовы склаў варшаўскі архітэктар Тэадор Бурш, і аднаўленчыя работы пачаліся. Да 1939 года часткова аднавілі тры замкавыя вежы і частку ўсходняга крыла палаца. У 1933 годзе князь Міхаіл перасяліўся ў замак. Для яго зрабілі асобны балкон на паўднёвым фасадзе палаца з відам на двор і стаў. Памёр князь у 1938 годзе, а ў верасні 1939-га пасля далучэння Заходняй Беларусі да БССР Мірскі замак быў нацыяналізаваны.

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны фашысты зрабілі ў замку гета, а пасля вайны тут пасяліліся жыхары з наваколля, якія страцілі пад час вайны жытло. Паступова яны збудавалі свае дамы, і замак зноў стаяў пусты і занядбаны. Як толькі ў БССР былі створаны спецыяльныя навукова-рэстаўрацыйныя майстэрні ў 1971 годзе, была зроблена часовая кансервацыя замкавых муроў і ўсе вежы замка накрылі гонтай.

У кастрычніку 1978 года Савет Міністраў БССР прыняў Пастанову аб рэстаўрацыі Мірскага замка. Пасля гістарычных і археалагічных даследаванняў і архітэктурных абмераў у 1981 годзе быў зроблены праект рэстаўрацыі (аўтары – архітэктары В. Атас, С. Верамейчык, В. Калнін, археолаг А. Трусаў). За аснову ўзялі воблік замка, які склаўся ў XVII стагоддзі, з выяўленнем і фрагментарнай рэстаўрацыяй некаторых фрагментаў XVI – XX стагоддзяў. Архітэктурны аб'ект падзялілі на тры зоны. Першая – зона адраджэння. Гэта самая захаваная частка замка, і тут прапанавалі зрабіць музей. Другая – зона адаптацыі. Частка замка, адноўленая ў 1920 – 1930-х гадах. Тут хацелі размясціць вытворчыя майстэрні мастацкага прафтэхвучылішча. Трэцяя – зона трансфармацыі. Гэта частка замка, пазбаўленая ўнутраных перакрыццяў і сцен. Тут планавалі зрабіць музей рэстаўрацыі замка, сувенірныя крамы і кавярню. Аднак за доўгія часы рэстаўрацыі, якая пачалася з закладкі першай рэстаўрацыйнай цагліны 25 чэрвеня 1983 года, сітуацыя змянілася. Быў прызначаны новы кіраўнік праекта рэстаўрацыі – архітэктар Д. Бубноўскі. 12 красавіка 1993 года была ўрачыста адкрыта першая музейная экспазіцыя ў адноўленай паўднёва-заходняй вежы. У 2000 годзе замкавы комплекс «Мір» уключаны ў Спіс аб'ектаў Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Урачыстае адкрыццё ўсяго музейнага комплексу адбылося ў снежні 2010 года. З таго часу яго наведваюць сотні тысяч турыстаў штогод.

*Алег ТРУСАЎ*

*Гэты тэкст распачынае серыю артыкулаў пра гісторыю і рэстаўрацыю беларускіх замкаў. На жаль, да нашага часу ў больш-менш цэлым выглядзе захавалася толькі некалькі беларускіх замкаў, у першую чаргу вышэй згаданыя Нясвіжскі і Мірскі. Іншыя захаваліся толькі часткова. Але некаторыя з іх цяпер кансервуюцца і рэстаўруюцца. Пра іх чытайце ў наступных нумарах «Краязнаўчай газеты».*



*Канут Русецкі. Мірскі замак. 1853 г.*



*Мірскі замак. Фота В. Дняпроўскага. 2018 г.*